Актуальнасць дадзенай тэмы і яе праблематыка заключаецца ў тым, што дасканала распрацаванай работы па гэтаму пытанню няма. Пры напісанні ставілася пэўная мэта: раз-гледзець комплекс вясельнай абраднасці ў кантэксце традыцыйнай беларускай культуры на Гродзеншчыне. Дзеля дасягнення мэты выразна акрэслена задача: даследаваць сацыяльны, духоўны і матэрыяльны аспекты традыцыйнай беларускай абраднасці на Гродзеншчыне ў 2-ой палове XIX – пачатку XX стст. Пры даследаванні і напісанні працы выкарыстоўваліся наступныя метады: пошук, апісанне і аналіз матэрыялу.

Няма сумненняў, што сям'я з'яўляецца важнай ячэйкай чалавечага грамадства. У мінулым нават традыцыйная культура існавала і развівалася ў межах сістэмы «сям'я – род – вясковая абшчына». Сям'я была першым звяном у гэтым ланцужку, і ад яе ў асноўным залежала фарміраванне будучага носьбіта і спажыўца гэтай культуры. Яна ўяўляла сабой складаную, надзвычай збалансаваную структуру, жыццядзейнасць якой падтрымлівалася комплексам звычаяў і абрадаў. Вясельны абрад – адзін з важнейшых цыклаў, які спалучаецца са шматлікімі фальклорнымі элементамі, суправаджаецца заключэннем шлюбу і з'яўляецца юрыдычным актам зацвярджэння новай сям'і.

Вяселле было важнай падзеяй у жыцці маладых. Гэтым тлумачыцца дакладная распраца-ванасць усіх сцэн і эпізодаў. Кожная песня, прыгаворка, прыказка, прамова, абрадавы танец складалі абавязковую частку пэўнага моманту рытуалу і строга падпарадкоўваліся яму.

Традыцыйнае беларускае вяселле на Гродзеншчыне дайшло да сённяшняга дня не як помнік сівой даўніны, а як дынамічна існуючая сістэма, якая займае адпаведнае месца ў абрадавай практыцы, аб чым сведчаць праведзеныя даследаванні на тэрыторыі Гродзенскай вобласці (апытанне жыхароў і запісы атрыманай інфармацыі).

У працы падрабязна разглядаецца цыклічнасць вясельнага абраду, звяртаецца ўвага на сацыяльны і духоўны аспекты кожнага цыкла. Трэба адзначыць, што адной з характэрных рыс беларускага вяселля з'яўляецца наяўнасць у ім старажытных рэлігійна-абрадавых і сацыяльна-бытавых элементаў, народных сімвалаў. Сэнс і значэнне кожнага з іх яскрава раскрываецца ў народных песнях, якія займаюць вялікае месца ў вясельнай драме (у працы прадстаўлены шэраг прыкладаў вуснай народнай творчасці Гродзенскага краю).

Песні ствараюць асаблівы, святочны настрой, надаюць яркую эмацыянальную афарбоўку кожнаму моманту вяселля, услаўляюць багацце і раскошу гаспадароў, ідэалізуюць вобразы нявесты і жаніха і г. д. Вялікае значэнне надаецца сімволіцы каравая, кветак, зерня, хлеба і солі, а таксама іншым вясельным атрыбутам, паэтыцы розных вясельных прыгаворак, віншаванняў, вершаваных прамоў. У іх таксама нямала цікавых назіранняў, вобразнасці, гумару, іншых адзнак сапраўднай паэзіі.

Праз здабыткі шматвекавой традыцыі, багацейшую сімволіку, разнастайныя мастацкія сродкі ярка выяўляецца маральна-псіхалагічнае хараство апаэтызаваных герояў вяселля. Вяселле з яго абрадамі, паэтычнай, музычнай і харэаграфічнай творчасцю выяўляе рысы нацыянальнага характару, адлюстроўвае развіццё розных грамадскіх уяўленняў, паняццяў, светапогляду і ідэалаў народа.

Увогуле ўся гісторыя народнай культуры сведчыць аб тым, што беларускае вяселле было і застаецца самым цікавым і багатым на разнастайныя звычаі, абрады і вусна-паэтычныя творы, у якіх надзвычай удала спалучаецца традыцыйнае і новае, сінтэзуюцца многія віды мастацтваў і абрадавыя дзеянні, закладзена мудрасць народнай філасофіі.

©ПДУ

## САКРАЛЬНАЯ ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

***Ю. С. ПРАКОФ'ЕВА***, **У. А. ЛОБАЧ**

In this article are considered the problems on studing the objects of sacral geography Belorussian`s Podvinje

Ключавыя словы: традыцыйная культура, Беларускае Падзвінне, прастора, сакральная геаграфія

Беларускае Падзвінне (Паазер'е) – паўночная частка нашай краіны, дзе ў выніку складаных этнагістарычных, палітычных і сацыяльных працэсаў склалася адметная культура, якая каранямі сваімі заглыблена ў сівую даўніну, разам з тым у пэўных рысах працягвае заставацца актуальнай часткай культуры сучаснай [1, с. 5].

Як сведчаць вынікі палявых этнаграфічных даследаванняў апошніх гадоў, на тэрыторыі Беларускага Падзвіння шмат дзе захаваліся і функцыянуюць разнастайныя месцы, адзначаныя іерафаніяй (праявай сакральнага), у структуру якіх уваходзяць гаі, рэкі, крыніцы, азёры, узвышшы, лагчыны, балоты, камяні ды г. д. Такім чынам, нягледзячы на шматвяковую гісторыю хрысціянскай царквы і яе актыўныя спробы выкараніць язычніцкія ўяўленні, вераванні і абрады, светапогляд беларускіх сялян яшчэ ў XX стагоддзі застаўся міфалагічным у сваёй аснове. Гэтая адметнасць традыцыйнага мыслення была абумоўлена цеснай знітаванасцю земляроба са светам прыроды, якая ўяўлялася жывой і адухоўленай, выступала надзейным партнёрам у быцці чалавека [2, с. 184].

Аб'екты сакральнай геаграфіі адыгрывалі значную ролю ў сістэме народнай медыцыны. Да іх асабліва ў святочныя дні неслі ахвяры, атрымліваючы пазбаўленне ад хвароб ці прафілактычную засцярогу ад іх. Паводле назапашанага матэрыяла, можна канстатаваць, што працэс навуковай верыфікацыі лекавых уласцівасцяў аб'ектаў, што стагоддзямі вызначаліся народам як «цудадзейныя», яшчэ толькі пачынаецца [3, с. 24]. Такім чынам, вылучэнне, сістэматызацыя дадзенага матэрыялу ў перспектыве дазволіць больш поўна аднавіць не толькі культурны, але і міфалагічны ландшафт Беларускага Падзвіння.

Безумоўна вялікай праблемай для сучаснага даследчыка з'яўляецца тое, што велізарны пласт мікратапанімікі, які з'яўляецца найбольш каштоўным для палявога даследчыка, незваротна згублены. Перш за ўсё гэта звязана з разбурэннем сістэмы сельскіх паселішчаў (асабліва хутарскога тыпу). Аднак, аналіз пісьмовых і этнаграфічных крыніц можа даць каштоўную інфармацыю для далейшага сінтэзу (абагульнення) і аналізу асаблівасцяў архаічнага светапогляду, якія складалі аснову міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў Падзвіння [4, с. 58].

Варта адзначыць, што на сучасным этапе адбываецца развіццё так званай «гісторыі рэгіёнаў», якая значна дапаўняе агульнае ўяўленне пра гісторыю і культуру нашай краіны. Дадзеная тэма з'яўляецца надзвычай актуальнай не толькі ў сілу слабай даследаванасці, але і па прычыне таго, што фіксацыя аб'ектаў сакральнай геаграфіі дазваляе выратоўваць іх ад знішчэння, праводзіць музеефікацыю і захоўваць для наступных пакаленняў.

**Літаратура**


1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2 Віцебскае Падзвінне / Т. *Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка* і інш.; Складальнік Т. Б. Варфаламеева. Мн.: Бел. навука, 2004 – 910 с.
2. *Лобач У. А.* Этнаграфія Беларусі: Вучэбна-метадычны комплекс. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.
3. *Лобач У. А. Волкаў А. А.* Аб'екты сакральнай геаграфіі ў народнай медыцыне Лепельшчыны. // Лепельскія чытанні (навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 565-годдзю г. Лепеля. – Лепель, 2004. – с. 22-26.
4. Этнагеаграфія Беларускага Паазер'я (заключны). Справаздача па тэме навуковага даследавання ГБ №3097. / Кір. *В. І. Шайкоў, У. А. Лобач, В. А. Емельянчык, Т. І. Каліноўская.* – Наваполацк, 2002. – 65 с.


© БГАМ

## ШЫЙНЫ І НАГРУДНЫ ДЭКОР У ТРАДЫЦЫЙНЫХ ЖАНОЧЫХ СТРОЯХ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ І ПАДНЯПРОЎЯ

***А. М. РАМАНЮК*, А. С. БОХАН**

Work of jewelry and textile art need to examination like memorial national culture, theirs study help keep and understand Belarusian traditions

Ключавыя словы: Усходняе і Заходняе Палессе, Падняпроўе, шыйны і нагрудны дэкор, упрыгажэнні, традыцыйныя беларускія строі

Адзенне з'яўляецца асноўнай этнавызначальнай прыкметай народа, доказам яго існавання, адметнасці, самастойнасці, унікальнасці. Сёння, калі Еўропа ўвайшла ў новае тысячагоддзе, пытанне этнічнага самазахавання нацыянальнасцяў падаецца асабліва актуальным. Хуткі навукова-тэхнічны прагрэс сцірае з памяці людзей былыя навыкі і веды, змяняе ўмовы існавання грамадства, таму надзвычай важна захоўваць творы мастацтва, мову, традыцыі.

Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Палессе і Падняпроўе займаюць асобную старонку ў вывучэнні беларускай этнаграфіі. З прычын асаблівых геаграфічных і сацыяльна-эканамічных умоваў існавання тут да 20 ст. у найлепшым стане захавалася нацыянальная традыцыя – творы мастацтва, прадметы побыту, вусна-паэтычная творчасць, абрады.

Прыкладам найвышэйшага ўздыму народнай мастацкай творчасці з'яўляюцца беларускія традыцыйныя строі, што сфарміраваліся ў канцы 19 – пач. 20 ст. Этнаграфічнае даследаванне рэгіёнаў Беларусі і навуковы аналіз вобразна-пластычных, арнаментальна-каларыстычных, канструктыўных, тэхналагічных і шэрагу іншых сродкаў і прыёмаў мастацкага вырашэння касцюма, праведзеныя этнографам і мастацтвазнаўцам М. Раманюком, дазволіў вылучыць адметныя комплексы адзення, характэрныя для пэўных тэрыторый, і ўвесці тэрмін «строі» для абазначэння лакальных комплексаў традыцыйнага адзення. Асобнай увагі заслугоўваюць разнастайныя спосабы іх аздаблення.

Шыйна-нагрудныя ювелірныя ўпрыгажэнні, біжутэрыя і здымная тэкстыльная аздоба, маюць непасрэднае дачыненне да аздаблення верху жаночай кашулі. Кожная гэтая ўмоўная група твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мае адметную спецыфіку. У ансамблі строяў шыйна-нагрудным упрыгажэнням надавалася адразу некалькі функцый. Яны давалі агульную інфармацыю аб чалавеку, дазвалялі вызначыць яго пол, узрост, веравызнанне, пасаду, былі паказчыкам сацыяльнага статусу, заможнасці, а таксама сведчылі аб ягоным гусце. Адначасова яны маглі быць амулетам-абярэгам, мець утылітарнае або чыста дэкаратыўнае прызначэнне. Аздоба дзякуючы сваім пластычным і